Репозиторий ВГУ

УДК 37.013:7.01

# Асноўныя ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы

**С.Р. Туболец**
*Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава»*

Сучаснасць характарызуецца імкненнем грамадства да стандартызацыі. Мэта сённяшняй масавай вытворчасці – выкананне запатрабаванняў спажыўца, што ідзе праз камадыфікацыю ўсяго, што толькі магчыма. Гэта шлях да шэрага маральных і матэрыяльных праблем, галоўныя з якіх – знішчэнне духоўных запытаў чалавека, актуалізацыя імгненных запатрабаванняў. Аднак прагрэсіўныя сілы імкнуцца фарміраваць гарманічную асобу, што магчыма праз развіццё творчага пачатку чалавека. Менавіта на гэта

***Адрес для корреспонденции:*** 210032, г. Витебск, ул. Чкалова, д. 30, кв. 237, e-mail: svetla237@rambler.ru – Туболец С.Г.

скіравана традыцыйная народная педагогіка, якая давала неабходны station-ноўчы жыццёвы вопыт, магчымасць адчуць напоўненасць жыцця, стымулявала разумовае развіццё і сацыяльную прыстасаванасць.

Сапраўдныя нацыянальныя традыцыі дазваляюць народу захоўваць сябе, процістаяць меркантылізму, інфармацыйнаму гвалту і бездухоўнасці, аднак яны не выкарыстоўваюцца належным чынам. З гэтага вынікае неабходнасць этнапедагагічнага, гістарычнага аналізу здзяйснення працэсу эстэтычнага выхавання асобы ў традыцыйнай педагогіцы і ўвядзення іх у практыку.

Педагогіка шукае новыя шляхі комплекснага ўплыву на асобу, бо страчваецца эфектыўнасць звыклых метадаў і прыёмаў. Між тым эстэтычнае выхаванне сярод усіх бакоў выхавання чалавека мае найбольшы інтэграцыйны патэнцыял, здольна сваімі сродкамі выконваць задачы ўсіх відаў выхавання. Яно рыхтуе выхаванцаў да найбольш аптымальнага і адэкватнага пачуццёва-эмацыянальнага і інтэлектуальнага ўключэння, да якаснага ўваходу ў рэальнае жыццё свайго грамадства.

Такім чынам, праз раскрыццё асноўных умоў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы (канца XIX – пачатку XX стагоддзя) мы імкнёмся да актывізацыі дадзеных традыцый у сучасную выхаваўчую практыку.

**Матэрыял і метады.** У якасці аб’екта даследавання мы разглядаем беларускую народную педагогіку, а прадмета – асноўныя ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя (што абумоўлена найбольшай распаўсюджанасцю ў дадзены перыяд традыцый беларускай педагогікі ў жыцці беларускага сялянства). Даследаванне выканана на матэрыялах вуснай народнай творчасці і этнаграфіі беларускага народа з выкарыстаннем комплексу ўзаемадапаўняльных метадаў: апісальна-аналітычнага, параўнальна-гістарычнага, гісторыка-педагагічнага аналізу, навукова-даследчых прыёмаў (інтэрпрэтацыя, супастаўленне, сістэматызацыя).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Народная педагогіка ўяўляе сабой адзін з гістарычных механізмаў, які грунтуецца на асаблівасцях этнасу і дазваляе не толькі фіксаваць пэўныя асаблівасці чалавечай суполкі, але і рэтранслююваць іх у будучыню. Выкарыстанне скарбаў народнай педагогікі дазваляе пераасэнсаваць і аднавіць багацце гістарычнай спадчыны, лепшых традыцый продкаў, уключыць іх у кантэкст сусветнай культуры.

На эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы істотна паўплываў шэраг умоў: агульнасць, калектыўнаць выхаваўчага ўздзеяння; пераемнасць з іншымі накірункамі выхавання; паслядоўнасць выхаваўчага працэсу; рацыянальнае выкарыстанне сродкаў і метадаў народнай педагогікі; цікавасць, любоў народа да прыгажосці; эстэтычныя здольнасці, эмацыянальная чуласць; улік узроставых асаблівасцей у выхаванні і г.д.

Сярод іх асноўнымі з’яўляюцца: прыроднае ўздзеянне; выхаванне ў працы; выкарыстанне патэнцыялу народнай творчасці; распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларуса трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары маральна-эстэтычнага жыцця).

<u>Прыроднае ўздзеянне.</u> Прыродная прыгажосць адкрываецца чалавеку паступова, праз пераўтвараючае ўздзеянне як на прадметы, так і з’явы прыроды. Праз гэта замацоўваецца ўладаранне асобы над рэчаіснасцю, выяўляюцца яе творчыя здольнасці. Разуменне, асэнсаванне чалавекам эстэтычных праяў прыроды перарастае ў жаданне жыць па законах прыгажосці, ствараць яе і берагчы, а назіранні за ёй вучаць мэтанакіраванасці і гармоніі. Г.Н. Волкаў даводзіць, што «прыродаадпаведны падыход у выхаванні забяспечвае гарманічны, комплексны падыход да фарміравання асобы, паколькі прырода аказвае камбінаванае ўздзеянне на пачуцці, свядомасць, паводзіны чалавека» [1]. Мы адзначаем, што развіццё беларусаў як нацыі су-

Репозиторий ВГУ

праваджаецца эстэтычнай адзнакай праяўленняў прыроды. Успрыняцце, перажыванне прыгажосці прыроды знітавана з ідэаламі і нормамі грамадства, што адлюстроўваюць уяўленні людзей аб гармоніі з'яў. Таму ўсё, што дапамагае, не перашкаджае прыродзе, разглядаецца як дабро, карысць, і наадварот.

Жыццё насельніцтва цесна звязана з прыродай, якая традыцыйна ўключаецца ў звычаі, вераванні беларусаў. Наогул, этнакультурныя традыцыі фарміраваліся пад прамым уздзеяннем прыроднага цыкла. Прырода аказвае ўплыў на быт і працу сялян, што падпарадкоўваюцца асаблівасцям свайго наваколля. Беларус імкнецца суадносіць уласны свет з гармоніяй наваколля. Нямецкі вучоны, падарожнік А. Гумбальдт звяртаў увагу на сувязь ландшафту з матэрыяльным і духоўным жыццём чалавека. Сёння філосаф В.Ф. Мартынаў разглядае прыродную гармонію неад'емнай часткай духоўнага жыцця чалавека [2]. Сапраўды, звычаі, абрады, працоўная дзейнасць беларусаў – усё прыстасавана да прыродна-кліматычных умоў, а гэта накладвае адбітак і на характар жыхароў.

Істотная рыса народнай эстэтыкі – адзінства чалавека з прыродай. Беларус не толькі не проціпастаўляе сябе прыродзе, але нават не выдзяляе сябе з яе, бо поўнасцю залежыць ад яе. Гэтыя погляды замацаваны ў фальклорных тэкстах, вывучэнне якіх дазволіла В.А. Маславай сфармуляваць вывад, што чалавек адносіўся да прыроды па ўзоры больш слабага да больш моцнага. Гэтым надавалася эстэтычная афарбоўка амаль усім прыродным з'явам. Ад бацькоў дзецям перадаваліся вобразныя назіранні, параўнанні, якія напоўнены практычным і выхаваўчым сэнсам, эстэтычным пачуццём. Назіранні за навакольным асяроддзем прыводзяць да ўзнікнення прыкмет, прасякнутых пачуццём эстэтычнага: «Мужыку лета – што святому рай».

На тэрыторыі Беларусі шырока распаўсюджаны замовы, пабудаваныя на ўсхваленні прыгожага, на паэтычных закліках да прыроды, да яе праяў з мэтай схіліць на свой бок, папрасіць дапамогі. Даследчыкі сыходзяцца ў тым, што замовы – помнікі эстэтычна-эмацыянальнай мастацкай мовы беларуса, абавязаныя нараджэннем як веры ў неабходнасць з дапамогай слова, магічнага дзеяння ператварыць жаданне ў рэальнасць, так і глыбокім пачуццём павагі і ўвасаблення прыроды.

Аб духоўнай сувязі працаўніка са светам прыроды, аб ушанаванні яе жывых і нежывых прадметаў і з'яў сведчыць старажытная каляндарна-абрадавая песня. У ёй прасочваюцца змены ў працы селяніна адпаведна з сезонамі года. Г.Н. Волкаў указвае, што песні садзейнічаюць эстэтычнаму, маральнаму выхаванню і непасрэдна, і апасродкавана [1]. Пра што б ні спяваў беларус, на яго нязменна ўплывае прыгожае ў прыродзе – выток эстэтычнай асалоды чалавека. З яе вынікаюць паэтычныя параўнанні, метафары, абуджаецца яе эстэтычная сіла – гэта ўзор для творчых праяў чалавека.

<u>Выхаванне ў працы як умова эстэтычнага выхавання.</u> Праца дала штуршок да развіцця чалавечай свядомасці і ўсіх чалавечых пачуццяў, у тым ліку і пачуцця прыгожага. Каштоўнасці, на якіх будуецца мастацтва, былі створаны народнай працоўнай дзейнасцю. Менавіта яна ставілася народнай педагогікай вышэй за іншыя сферы дзейнасці, таму да яе фарміраваліся ўзвышаныя адносіны. Шэраг прыказак сведчыць аб тым, што здольнасць да працы лічылася галоўнай нормай ацэнкі чалавека.

Падмуркам народнага выхавання з'яўляецца выніковая праца, якая звязвае ўсе сродкі выхавання ў адзінае цэлае. Яна, як своеасаблівая гісторыя народа, знаходзіць увасабленне ў святах, абрадах, фальклоры. Выхаванне ў працы ёсць адна з галоўных умоў здзяйснення эстэтычнага выхавання, бо жыццё – гэта падпарадкаванне навакольнага свету з мэтай задавальнення сваіх патрэб. Працоўныя намаганні маюць на мэце пэўны вынік, які валодае

Репозиторий ВГУ

утылітарна-практычнай і духоўнай значнасцю. Гэта рэч і эстэтычнае перажыванне, якое грунтуецца на эмацыянальнай адзнацы якасці прадукта, і майстэрства творцы. Неабходныя рэчы традыцыйна стваралі такімі, каб яны ў найбольшай ступені адпавядалі свайму прызначэнню: формай, якасцю, мэтазгоднасцю. Выхаванне ў працы дазволіла беларусу асэнсаваць каштоўнасці рытму, прапарцыянальнасці, суразмернасці прадуктаў і вытворчых дзеянняў. Эстэтычнае адчуванне формы ідзе з радаснага самаадчування, якое выклікае арганізаванасць працоўнага працэсу, што аблягчае працу, узнімае яе якасць і вытворчасць. Узнікненне падобнага пачуцця выклікае знешні выгляд рэчы, якая ствараецца чалавекам. Так, выраб рэчаў становіцца свабоднай, асэнсаванай працай, якая прыносіць эстэтычнае задавальненне і радасць. Прыгажосць і карысць сплятаюцца ў адзінае: кожны, хто жадае быць майстрам, павінен валодаць рамяством ва ўсёй яго паўнаце. Адсюль вытокі цікавасці да работы і прыгожага яе выканання – творчасці. Тут фармулюецца запаведзь народнай педагогікі – трэба любіць працу і людзей працы. Народ разумее, што чалавек працавітым выхоўваецца, і гэта якасць пераклікаецца з эстэтычным светаўспрыманнем. Аб ступені даросласці мяркуюць на падставе таго, што і як чалавек умее рабіць.

Паколькі галоўнай мерай духоўнасці і эстэтычнай каштоўнасці з'яўляецца праца, таму і эстэтычнае выхаванне ажыццяўляецца ў працэсе працы. Невыпадкова ў вуснай народнай творчасці прэвалюе працоўная тэматыка. Сцвярджаецца, што працоўнае выхаванне – умова фарміравання эстэтычных густаў, пачуццяў. Асноўныя погляды на працу: усе павінны працаваць, адносіны да працы павінны быць эстэтычнымі (уменне бачыць сэнс у справе, імкненне выканаць яе хутка, прыгожа, якасна, спрытна).

Унясенню эстэтычных элементаў ва ўмовы дзейнасці, праяўленню прыгажосці служылі народныя песні, непасрэдна звязаныя з працоўнымі працэсамі. У песнях прыгожае – мэта, а сама праца – сродак. Праз працу ўстанаўліваецца сувязь эстэтычнага з іншымі накірункамі выхавання. Песні агучвалі ідэалы беларускага народа, яны напоўнены моцам эмацыянальнага ўздзеяння, абуджалі і ўскалыхвалі пачуцці. Песенная традыцыя беларускага народа арганічна звязана са святамі. У.Ф. Мартынаў скіроўвае ўвагу на тое, што чалавек «святкаваў быццё» больш за палову часу ў годзе [2]. Святы прымяркоўваліся не толькі да вольных дзён, але і да выканання пэўных сельскагаспадарчых работ. Сувязь свята і працы тлумачылася імкненнем чалавека эстэтызаваць жыццё, зрабіць паўсядзённыя абавязкі больш жаданымі і прывабнымі. У народным свяце, як сведчаць этнаграфічныя, фалькларыстычныя матэрыялы, у адзіным коле абрады, песні, праца, танцы – разнастайныя сродкі і метады народнай педагогікі.

Так, штодзённыя клопаты беларуса даюць штуршок да стварэння эстэтычна завершаных і сэнсава значымых твораў. Праца дапамагае не толькі ўспрымаць прыгожае, але і ствараць рэчаіснасць па яе законах. Гэта аказвае ўздзеянне на эстэтычнае выхаванне чалавека. Выхаванне ў працы дазваляе асобе рухацца наперад у пазнанні эстэтычнага, выступае крыніцай натхнення эстэтычна значымай творчасці.

<u>Выхаваўчы патэнцыял народнай творчасці.</u> Беларуская народная творчасць адлюстроўвае сабой духоўны вопыт і эстэтычны густ, ідэалы народнай эстэтыкі. Яна яднае індывідуальную творчасць і калектыўную мастацкую свядомасць. У.М. Конан разглядае традыцыйную народную культуру як першасную форму эстэтычнага засваення і мастацкага выяўлення быцця культуры. У прыватнасці, ён піша: «Архаічныя тыпы культуры (міфа-паэтычная творчасць) характарызуюцца аксіялагічным сінкрэтызмам – адзінствам практычна-жыццёвых (утылітарных), этычных, рэлігійных і эстэтычных каштоўна-

Рэпазіторый ВДУ

сцей – карыснага, прыгожага, добрага і святога» [3]. Такім чынам, народная культура, народжаная творчасцю простага чалавека, нясе духоўны пачатак, сцвярджае гуманізм, свабоду, сацыяльную самастойнасць асобы, адлюстроўвае жыццё ва ўсёй яго глыбіні і паўнаце. Традыцыйная народная творчасць ярка, поўна і своеасабліва выяўляе этнічныя асаблівасці народа, яго эстэтычныя густы і светасузіранне.

Даследчыкі К.П. Кабашнікаў, А.І. Гурскі, М.А. Янкоўскі прыйшлі да высновы, што вядучая грамадская функцыя народнага мастацтва – выхаваўчая. Мастацтва разглядае жыццё з улікам эстэтычнай характарыстыкі, садзейнічае фарміраванню асобы, яе маральных асноў, адносін да жыцця, развівае эстэтычныя пачуцці, творчыя здольнасці.

Народнае мастацтва цесна звязана з мовай, якая «выступае галоўным інструментам перадачы і захавання змястоўных канцэптаў духоўнай культуры, эстэтычным інтэгратарам этнічных уласцівасцей, якасцей, уласцівых дадзенаму этнасацыяльнаму арганізму» [4]. Яшчэ К.Д. Ушынскі абгрунтаваў канцэпцыю роднай мовы як крыніцы і сродку ўсебаковага развіцця чалавека, яго духоўнасці. Паводле тэорыі В. Гумбальдта, мова – гэта бесперапынны працэс духоўнай творчасці, які акрэслівае ўсе духоўныя адносіны чалавека да свету. У ёй гарманічна спалучаецца эстэтычны змест думак і мар народа, замацоўваецца разуменне прыгажосці рэчаіснасці.

Можна сцвярджаць, што бацькоўская мова з'яўляецца моцным сродкам эстэтычнага выхавання. Аб гэтым сведчыць выказаная філолагам-славістам А. Патабнёй ідэя аб першаснасці мовы перад творчасцю, тоеснасці мастацтва і слова. На падставе думкі, што ўся мова і кожнае асобнае слова адпавядаюць мастацтву, мовазнаўца Л.У. Шчэрба абгрунтаваў канцэпцыю абумоўленасці мовай развіцця мастацтва. Мова арганізуе і развівае духоўную творчасць, акрэслівае адносіны асобы да свету, гарманічна спалучае эстэтыку думак і памкненняў людзей, адлюстроўвае і асэнсоўвае гармонію жыцця і наваколля. Мову можна разглядаць як своеасаблівы паказчык духоўнага развіцця народа, бо яна – выток вусна-паэтычнай творчасці беларусаў, дзе замацаваны маральна-этычны і эстэтычны ідэалы народа.

Аналіз твораў вуснай народнай творчасці дае падставы сцвярджаць, што ідэал прыгажосці арганічна пераплецены з маральнасцю. Прыгажосць супадае з дабром: таму можна меркаваць аб маральнай функцыі эстэтычнага ідэалу ў беларускай народнай педагогіцы. У.М. Конан выводзіць вітаісцкую сутнасць народнай эстэтыкі, у якой «універсальнае дабро – усё, што нараджала і захоўвала жыццё на Зямлі. А злом аказаліся процілеглыя жыццю з'явы і падзеі» [3]. Мы падзяляем меркаванне Л.С. Аляксеевай, што «дзякуючы прыгажосці людзі інтуітыўна цягнуцца да дабра яшчэ да таго, як ідэя дабра будзе асэнсавана ўспрынята іх маральнай свядомасцю» [5]. Прыгажосць паводзін як частка маральнай і грамадскай дзейнасці заўсёды разглядалася беларусамі як спосаб самаўдасканальвання чалавека, павелічэння багацця яго духоўнага свету, культурных запатрабаванняў.

Акрамя фальклорных твораў, свой уплыў на выхаванне асобы робіць эстэтычна арганізаваная рэчаіснасць. Імкненне да прыгожага знаходзіць адлюстраванне ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, матэрыяльнай культуры. Нават пры выбары месца для жылля ацэньваліся не толькі ўрадлівасць глебы, экалагічны стан, але і прыгажосць месца. Беларуская вёска падае прыклад гармоніі чалавека і прыроды, прыстасавання першага да ўмоў асяроддзя. У гэтым бачыцца паяднанасць эстэтычнага і утылітарнага.

Важныя часткі народнага мастацтва – танец, музыка, песні, гульні, святочнае адзенне і г.д. – яднаюцца ў народных святах, звычаях, абрадах, што выступаюць скарбонкай эстэтычных здабыткаў беларусаў. Народныя святы як

Рэпазіторый ВДУ

адзін з відаў творчасці народа, што садзейнічае фарміраванню выхаваўчай дамінанты, патрабуюць асаблівай увагі. Кожны чалавек імкнецца выканаць сваю ролю на вачах аднавяскоўцаў як мага лепш, больш эстэтычна.

Ствараецца культ гармоніі, ідзе развіццё здольнасцяў да эмпатыі, саманазірання, самавыхавання, нараджаюцца эстэтычныя пачуцці.

Распаўсюджванне ў паўсядзённым жыцці беларуса трыяды: мары, народныя вераванні, успаміны (інтэнсіфікатары маральна-эстэтычнага жыцця). Народ становіцца народам дзякуючы сваім поглядам, вераванням. Беларуская міфалогія захавала не толькі вобразы першапачатковых боскіх і дэманічных істот, але і правілы ўзаемадзеяння з імі, варыянты чалавечых паводзін, каб дабіцца спагады, абароны ад звышнатуральнай сілы з'яў. Г.Н. Волкаў піша, што будынак чалавечай асобы ўяўляецца як бы пабудаваным на чатырох «гранітных слупах» – самым трывалым з падмуркаў: навука (веды), рэлігія (вера), мастацтва (прыгажосць), выхаванне (любоў). Адзначым, што беларуская народная педагогіка адводзіла кожнаму з іх пэўнае месца. З дапамогай традыцыйнага ўкладу, падыходаў да выхавання і жыцця ў асобе ўзмацняўся духоўны падмурак. Веды аб вядзенні гаспадаркі, чалавечых зносінах, Сусвеце; уяўленні пра рэальны і нябачны свет, яго пабудову; адносіны да бацькоў, дзетак – усё прасякнута прыгажосцю.

Беларус марыць аб шчасці: асэнсаванай працы, якая нясе дабрабыт у сям'ю, здароўі як для дарослых, так і для маленькіх, аб мірным жыцці. Адлюстраваны мары чалавека ў песнях, казках, паданнях, заморах – ва ўсіх жанрах вуснай народнай творчасці. Калектыўныя ўяўленні аб ідэальным жыцці пераўтвараюцца ў пэўныя абрадавыя дзеянні. Згодна з Э. Дзюркгеймам, гэтыя дзеянні падразумяваюць уздзеянне і рэагаванне з боку іншага і самі выступаюць вынікам такіх узаемадзеянняў. Аднолькавыя словы, жэсты, якія адносяцца да адной рэчы, пераўтвараюць людзей у еднасць, у цэлае. Роля калектыўных дзеянняў заключаецца ў тым, што група асэнсоўвае, усведамляе сябе, сваю існасць. Калектыўныя дзеянні становяцца сімваламі – умоўнымі знакамі сэнсавага выражэння грамадскай свядомасці. Такая сімволіка перадаецца з пакалення ў пакаленне, незалежна ад асобных прадстаўнікоў супольнасці, суправаджае ўсе значныя падзеі грамадства. Свая сімволіка існуе і для духоўна-маральнага жыцця чалавека. У гэтай сувязі асабліва важныя народныя абрады. Між імі асаблівае месца належыць рытуалам пераходу – нараджэння, вясельны і пахавальны. Кожны з іх сімвалізуе асаблівыя формы ўзаемадзеяння і адносін паміж людзьмі, спрыяе зняццю псіха-эмацыйнага напружання, дазваляе звярнуць увагу на эстэтычны аспект рэчаіснасці. У абрадавых дзеяннях прасочваецца сацыяльная матывацыя: прыняцце і захаванне індывідам яго статусу і асэнсаванне перамен, што непазбежныя з часам. Практыка абрадавых дзеянняў накіравана на рэгламентацыю працэсаў засваення культурных роляў і норм паводзін у розныя стадыі жыцця. Чалавечыя ўчынкі, перажыванні, ідэалы з'яўляюцца каналамі сувязі мінулага і сучаснага – гістарычнай і паўсядзённай памяццю.

Прыгажосць як месца сутыкнення двух сусветаў ёсць увядзенне быцця ў маральны аспект праз яго адухаўленне, працяг пачатай прыродай мастацкай справы ў святле будучай рэчаіснасці, інакш кажучы, пачуццёвае адлюстраванне ў матэрыяльным свеце ісціны і дабра. З дапамогай мастацтва чалавек рабіў спробу паўплываць на долю: асабістую ці значных для яго людзей (што вяло да эстэтычнага асэнсавання рэчаіснасці). Гэтыя абрады прасочваюцца ва ўсім гадавым абрадавым цыкле. Аб гэтым сведчыць І.С. Сычова: «Толькі кананічна правільнае і па-мастацку дасканалае выкананне абраду магло забяспечыць дабрабыт, што садзейнічала практычна-

дзейнаснаму характару эстэтычнага выхавання, павышала значнасць навыкаў у галіне народнага мастацтва» [6].

Жыццё і смерць падзяляюць прастору на «гэты» і «той» свет. Праз успаміны беларусы іх аб'ядноўваюць, уводзяць у кола сучаснасці тых, хто ўжо сышоў у нябыт. Гэтая галіна духоўнага жыцця прасочваецца ў рытуальных дзеяннях, у абрадах памінання продкаў на так званыя Дзяды.

Успаміны як асэнсаваны расповед пра мінулае, пра традыцыі сям'і, роду, станоўчыя прыклады жыцця бліжэйшай суполкі напаўнялі і штодзённае жыццё. Яны дазволілі скласціся сістэме народных прыкмет аграрнага календара, замацавалі каштоўнасныя традыцыі пашаны старэйшых. Усё гэта служыла асновай інтэнсіфікацыі маральна-эстэтычнага ўспрыняцця свету.

**Заключэнне.** Галоўныя ўмовы рэалізацыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: прыроднае ўздзеянне; выхаванне ў працы; выкарыстанне творчага патэнцыялу народнага мастацтва; мары, забабоны, успаміны – найбольш эфектыўныя сродкі інтэнсіфікацыі маральна-эстэтычнага жыцця – дазваляюць вырашаць шмат выхаваўчых задач: ад абуджэння эстэтычных пачуццяў, фарміравання эстэтычнай свядомасці да патрэбы змяняць рэчаіснасць па законах прыгажосці. Эстэтычныя пачуцці дапамагаюць інтэграваць народ у адзінае, пабудаваць жыццё па законах прыгажосці, творчасці і гармоніі.

Мы сцвярджаем, што патэнцыял беларускай педагогікі абуджае эстэтычныя думкі і пачуцці, фарміруе культ гармоніі, развівае эмпатычныя здольнасці чалавека, вучыць саманазіранню. Гэта дае магчымасць садзейнічаць выхаванню эстэтычна развітога чалавека на ідэалах народнай эстэтыкі праз актыўнае ўвядзенне пазітыўных традыцый беларускай народнай педагогікі ў сучасны выхаваўчы працэс шляхам прадстаўлення асноўных умоў эстэтычнага выхавання ў народзе.

## *Л І Т А Р А Т У Р А*


1. ***Волков, Г.Н.*** Этнопедагогика / Г.Н. Волков. – М.: Академия, 2000. – С. 129.
2. ***Мартынов, В.Ф.*** Философия красоты / В.Ф. Мартынов. – Минск: ТетраСистемс, 1999. – 336 с.
3. ***Конан, У.М.*** Фальклор як мастацкая сістэма і яго актуалізацыя ў адукацыі / У.М. Конан // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 7. – С. 61.
4. ***Салееў, В.А.*** Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы / В.А. Салееў. – Мінск: НІА, 1994. – С. 168.
5. ***Алексеева, Л.С.*** Эстетическое воспитание в русской народной педагогике: дис. … канд. пед. наук: 13. 00. 01 / Л.С. Алексеева; Пятигорский гос. лингв. ун-т. – Пятигорск, 2002. – С. 43.
6. ***Сычова, І.І.*** Прынцыпы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / І.І. Сычова // Адукацыя і выхаванне. – 2006. – № 10. – С. 69.



## *S U M M A R Y*

*The article deals with the main conditions of implementing the aesthetic education in Belarusian folk (popular) pedagogy (of late 19-th – early 20-th centuries). The following aspects are considered: influence of the nature, education through labour, using opportunities offered by folk art and crafts, expansion in the Belarusian daily life of the triplet: dreams, popular beliefs, memories (intensifiers of moral-aesthetic life).*



*Поступила в редакцию 22.04.2010*





Репозиторий ВГУ